# Іван Ціханавіч Старасценка



Старажыл вёскі Баханы. За сваё жыццё, а нарадзіўся ён у 1901 годзе, гэты чалавек пабачыў вельмі многае. Так склалася, што закончыў усяго толькі чатыры класы царкоўна-прыходскай школы.

-Урокі ў школе пачыналіся з малітвы,- успамінае Іван Ціханавіч. - Вось таму і верую ў Бога і ікону маю. Царква ў Баханах была да вайны, ды немцы спалілі.

Памятае старажыл і Кастрычніцкую рэвалюцыю 1917 года.

У 30-я гады пачалі калгасы ўтварацца ў рэспубліцы. Разам з жонкай Уллянай працаваў у калгасе. Спачатку калгаснікам, потым прызначылі брыгадзірам паляводчай брыгады. Перад пачаткам вайны з Германіей наш калгас ужо, як гаворыцца, “моцна стаў на ногі”. І хоць мала было трактароў, а ў асноўным працавалі на конях, мы з радасцю ішлі па працу. Бывала, жнуць жанчыны збожжа сярпамі і спяваюць, ды так прыгожа! А з працы вярталіся зморыныя, але ж зноў з песнямі. І грошай атрымлівалі мізэр, таму што на працадні рабілі. А весела як было на вёсцы! Не тое, пгго зараз.

Усё б было добра, калі б не нядзельная раніца 22 чэрвеня 1941 г. , калі ў іх дом уварвалася страшэннае, ледзяняшчае душу слова: “Вайна!”.

У першых чыслах ліпеня яго прызываюць у армію. Дома засталася жонка з двумя сынамі. Разам з аднавяскоўцамі прыбыў г.Ялец. Там фарміраваліся часці для адпраўкі на фронт. Папаў служыць у пяхоту. Першыя баі былі на Арлоўшчыне. Дзяліць не прыходзілася: усе былі цяжкія, крывапралітныя, прыносячы раненні, калецтвы, а вельмі часта і смерць. А потым было акружэнне і палон. На цягніку спачатку

прывезлі ў Гомель. Рыхтавалі да адпраўкі далей у Бабруйск. Нядоўга я быў у палоне: усяго 12 дзён, - усміхнуўся былы салдат. - Не мог з гэтым змірыцца. Вырашыў уцячы. Зваў і таварышаў, але яны адмовіліся, вось адзін і ўцёк прама з рухаючагася цягніка… Пеша, абыходзячы вялікія дарогі, гарады, вёскі, дабраўся Іван Ціханавіч да Баханоў. Так і жыў там, пакуль у верасні 1943 года не прыйшло вызваленне. Затым усіх мужчын і юнакоў прызыўнога ўзросту прызвалі ў армію. Зноў фронт: рака Іроня. Вельмі многа тут загінула людзей. Іван Ціханавіч у баях на гэтай рэчцы атрымаў лёгкае раненне ў руку. Яго накіравалі ў г. Клімавічы ў шпіталь. Лячыўся месяц, а затым трапіў на другі Беларускі фронт. Прымаў удзел у вызваленні гарадоў Крычаў, Чэрыкаў. Пры фарсіраванні невялікай, але глыбокай рэчкі Рэста, што на Магілёўшчыне, Іван Ціханавіч праявіў гераізм. Адным з першых ён пераправіўся цераз яе і завязаў бой у акопах з немцамі, а потым падаспелі на дапамогу таварышы. За гэты бой ён атрымаў ордэн Славы трэццей ступені. А ў хуткім часе яшче адна ўзнагарода - медаль "За адвагу" з'явілася на гімпасцёрцы нашага земляка. Камандаванне дала загад правесці разведку боем. - Нас было ўсяго 18 чалавек,- расказвае І.Ц. Старасценка. - Уварваліся ў нямецкія акопы каго прыкончылі прама на месцы, хто змог, той уцёк. а аднаго фашыста "языка" даставілі ў сваю часць. Праўда, і ў нас не абыйшлося без страт: трое хлапцоў загінулі.

З баямі прайшоў Беларусь, Польшчу. Дайшоў да Германіі. Вайна для яго закончылася на р.Одэр. Вярнуўся дамоў, у Баханы. Прымаў удзел у аднаўленні разбуранай гаспадаркі. Цяжка было на першых парах. То аднаго, то другога не хапала. Але ж выстаялі! Доўгі час работаў у калгасе кладаўшчыком. потым вартаўніком фермы. Да баявых узнагарод прыбавіліся шмат юбілейных, а сярод іх і ордэн Айчыннай вайны.

**Іван Ціханавіч Старасценка** : ветэран Вялікай Айчыннай вайны, старажыл в. Баханы // Шлях Кастрычніка.